# Абнавілася бібліятэка

***НЯДАЎНА** я наведала Кунцаўшчынскую сельскую бібліятэку і была здзіўлена тымі зменамі, якія ў ёй адбыліся. З першага погляду мне здалося, што нешта пераблытала і патрапіла не туды. Бо ўсё нагадвала творчую майстэрню, а не чытацкую залу. Акрамя кніг тут шмат дзіцячых малюнкаў і вырабаў з саломкі. Як мне потым растлумачылі, праходзіць выстаўка "Не дрэмлюць рукі малых майстроў".*

Заўважаю, у зале з'явілася шмат новых рэчаў. Найвялікшае захапленне выклікаюць кветкі: маленькія кактусы, невялічкія дрэўцы ўпрыгожваюць паліцы з кнігамі. Сярод кніг і часопісаў таксама папаўненне: "Нёман", "Спадчына", "Беларуская думка". З'явіліся ў бібліятэцы і новыя раздзелы: "Сацыяльна-інфармацыйны", Гістарычны", "Цэнтр сямейнай адукацыі". Гэта ў шмат разоў аблягчае нам пошукі патрэбнай кнігі. А калі набліжаецца свята, то тут можна знайсці і сцэнарый да яго.

Загадчыца бібліятэкі Ганна Паўлаўна Кухарчык з натхненнем гаворыць пра сваю работу, аказвае яшчэ і метадычную дапамогу Кунцаўшчынскай пачатковай школе. Ні адно святочнае мерапрыемства не абыходзіцца без яе ўдзелу. З настаўнікамі ў яе завязаліся сапраўды творчыя кантакты.

Пагадзіцеся, бібліятэка для малышоў — гэта першае знаёмства з кнігай. Тут шмат раздзелаў, дзе школьнік можа не толькі пазнаёміцца з праграмнай літаратурай, але і з навакольным асяроддзем: "Пра птушак і звярушак", "Прырода просіць дапамогі" і іншыя. На гэтыя ж тэмы Ганна Паўлаўна з юнымі чытачамі наладжвае ўрокі дабрыні, на якія прыходзяць не толькі пачаткоўцы, але і дашкалята. Папулярнасцю ў дзяцей карыстаецца і бібліятэчны гурток — філейнай вышыўкі.

І сапраўды ў бібліятэцы ёсць месца, дзе можна ўтульна размясціцца. Зручна абсталяваны пакой запрашае займацца справай.

Што ж паспрыяла такім цудоўным зменам?

У гутарцы з загадчыцай я знайшла адказ. Дапамогу бібліятэцы аказаў дырэктар агра-гандлёвай фірмы "Ждановічы" Рыгор Пятровіч Чуйко. Летась за выдзеленыя гаспадаркай грошы быў зроблены касметычны рамонт. А сёння яна фінансуе ўстанову культуры. Гэта і дало магчымасць купіць новае абсталяванне: сталы, дываны, карціны, кветкі. І ў Ганны Паўлаўны Кухарчык прыўзняты настрой, яна ўпэўнена, што спонсар не адмовіць і ў будучай яе просьбе, бо сам вельмі зацікаўлены, каб дзеці і іх бацькі больш чыталі, былі адукаванымі, культурнымі людзьмі. Менавіта дзякуючы Рыгору Пятровічу бібліятэка цяпер мае новы выгляд.

Развітваючыся, я прыкмячаю, як адзін за другім ідуць сюды маленькія чытачы, з цікаўнасцю разглядаючы выставы малюнкаў, работ умельцаў.

І яшчэ раз упэўніваюся: свет не без добрых людзей!

**Вераніка МАРОЗ.**
в. Кунцаўшчына.

Наша жыццё - 2000г. - 7 чэрвеня